CORE
Metadata, citation and similar papers at core.ac.uk

МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ
УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ
«ПОЛОЦКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ»

# ТРУДЫ

## МОЛОДЫХ СПЕЦИАЛИСТОВ ПОЛОЦКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО УНИВЕРСИТЕТА

Основан в 2004 г.

Выпуск 14

## ЮРИДИЧЕСКИЕ НАУКИ

Теория и история государства и права
Конституционное и административное право
Уголовное право и процесс,
криминалистика и криминология
Гражданское право и процесс
Международное право

Новополоцк
2006

УДК 27(476)

# ДЗЯРЖАВА І РЭЛІГІЙНЫЯ ПЛЫНІ Ў ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ: ПРЫНЦЫПЫ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ

*В.У. ЧАРАЎКО*
*Прадстаўлена: канд. гіст. навук, праф. В.І. ШАЙКОЎ*

*Артыкул прысвечаны аналізу рэлігійных адносін у ВКЛ у перыяд поліканфесійнай талерантнасці (1563 – 1596). Раскрыты некаторыя прынцыпы фарміравання мадэляў рэлігійных адносін.*

Рэлігійнае жыццё ў Вялікім княстве Літоўскім было іншым, чым у суседніх краінах. «В Московском государстве православная церковь была господствующею; все прочие веры были лишь терпимы под тем непременным условием, чтобы они не касались прав господствующей церкви и не совращали её чад...», – адзначае мітрапаліт Макарый [1]. Тое ж можна сказаць пра Польшчу, толькі пануючай рэлігіяй там было каталіцтва.

Насельніцтва Вялікага княства Літоўскага з'яўлялася поліканфесійным, што сустракалася тады не дужа часта [2, с. 280]. Мелася тэндэнцыя да павелічэння кольскасці канфесій. Веравызнанні аказвалі на грамадства неаднолькавы ўплыў. Уздзеянне адных (мусульманства, іудаізму, стараабрадніцтва) было адносна невялікім. Другія, наадварот, сваім існаваннем і ўзаемадзеяннем вызначалі спецыфіку рэлігійных адносін працяглы час. Да іх належаць праваслаўе і каталіцтва. Трэція плыні аказвалі на канфесійныя адносіны ВКЛ моцнае ўздзеянне, але не так доўга, як веравызнанні другой групы. Да іх можна аднесці пратэстантызм і уніяцтва.

Кожны рэлігійны рух прыўносіў у міжканфесійныя стасункі нешта новае. У розныя перыяды адны і тыя ж рэлігійныя плыні знаходзіліся ў неаднолькавым становішчы: узмацняліся ці перажывалі крызіс, ажыццяўлялі актыўную экспансію або абараняліся ад яе. Усё гэта садзейнічала развіццю адносін канфесій і ўлады, фарміраванню аптымальных мадэляў іх узаемадзеяння.

Вызначым, што ўключае паняцце мадэлі ўзаемаадносін веравызнанняў і дзяржавы. Па-першае, характар міжканфесійных стасункаў у асяроддзі свецкага насельніцтва (адносіны паміж прадстаўнікамі духавенства па вызначэнні будуць больш напружанымі). Па-другое, дзяржаўную рэлігійную палітыку.

У 70 – 80-я гады XVI стагоддзя, адзначае С.А. Падокшын, у грамадскай свядомасці ВКЛ акрэсліліся дзьве мадэлі рэлігійна-царкоўнага жыцця [3, с. 14]. Першая – плюралістычная, ліберальна-дэмакратычная, рэнесансна-гуманістычная – грунтавалася на прынцыпах талерантнасці, другая – унітарная, уніяцкая, контррэфармацыйная – прадугледжвала аб'яднанне (унію) цэркваў для спынення іх барацьбы [3, с. 38 – 39]. 1570 – 1580-я гады адметныя не толькі акрэсленнем згаданых мадэляў у грамадскай свядомасці. Рэнесансна-гуманістычная мадэль у ВКЛ якраз тады рэалізоўвалася, у 1596 годзе пачала ажыццяўляцца яе альтэрнатыва. Іх наяўнасць не абмяжоўваецца другой паловай XVI стагоддзя. Дзьве мадэлі канфесійных адносін, заснаваныя адна на талерантнасці, а другая на уніфікацыі (назавем іх верацярпімай і уніфікуючай), з'яўляліся базавымі на працягу ўсяго перыяду існавання Княства [4, с. 38 – 39].

Што ўяўляюць сабой механізмы ўсталявання і развіцця мадэляў рэлігійных адносін, якім чынам адбывалася ўключэнне новых плыняў у канфесійную прастору ВКЛ? Адказаць на гэтае пытанне дазваляе вывучэнне ўплыву Рэфармацыі на рэлігійныя працэсы Княства.

Пачаткам Рэфармацыі ў ВКЛ лічыцца 1553 год, калі ўплывовы магнат Мікалай Радзівіл Чорны з каталіцтва перайшоў у пратэстантызм, перавёў у яго шматлікае падуладнае насельніцтва і пачаў умацоўваць новую веру [5, с. 224]. Да гэтага, зразумела, пратэстанцтва павінна было быць ужо вядомым у Княстве. У ВКЛ тады існавала біканфесійна-парытэтная талерантнасць, пры якой прызнавалася роўнасць дзьвюх хрысціянскіх плыняў – праваслаўя і каталіцтва [4, с. 39]. Гэта, аднак, не азначала, што на рэфармацыйны рух былі механічна пашыраны нормы верацярпімасці. У 1535 годзе Жыгімонт I выдаў спецыяльны дэкрэт, скіраваны супраць распаўсюджвання Рэфармацыі [1]. Прызнаваць слабы пакуль пратэстантызм роўным каталіцтву і праваслаўю ніхто не збіраўся.

Надзвычай хуткае пашырэнне Рэфармацыі мела вынікам поўнае ўраўнаванне ў правах феадалаў-хрысціян (католікаў, праваслаўных, пратэстантаў) паводле прынятай на Віленскім сойме 1563 года дэкларацыі: «... на достоинства и преложеньства всякие, и до рады нашое, и на уряды дворные и земские, не только подданые костёлы Римскому от того часу обираны и перекладаны быти мають, але одинако и заровно вси рыцерского стану з народу шляхетского люди веры хрестиянское...» [5, с. 198; 6, с. 80]. Дэкларацыя азначала ўсталяванне рэнесансна-гуманістычнага варыянту верацярпімай мадэлі і пачатак перыяду поліканфесійнай талерантнасці (1563 – 1596) [4, с. 39]. Ці было гэта простым вынікам Рэфармацыі, пашырэння пратэстанцкіх плыняў? Відавочна, не. Пратэстантызм не больш схільны да талерантнасці, чым каталіцтва або праваслаўе. Узгадаем, як жорстка абыходзіліся з рэлігійнымі «апанентамі» «бацькі» пратэстантызму Лютэр і Кальвін [7, с. 97 – 98, 114]. Зрэшты, пашырэнне Рэфармацыі ў ВКЛ адбывалася якраз за кошт каталіцкай і праваслаўнай цэркваў.

Калі ўлічыць, што ад пачатку масавага пашырэння Рэфармацыі у 1553 годзе да поўнага ўраўнавання яе прыхільнікаў у правах з католікамі прайшло ўсяго дзесяць гадоў (праваслаўная царква не магла дабіцца гэтага больш за паўтара стагоддзя), становіцца зразумелым, што наступнае дзесяцігоддзе магло стаць для касцёлу ў ВКЛ апошнім. Далейшае ўмацаванне пратэстантызму павінна было прывесці традыцыйныя «грэчаскую» і «лацінскую» канфесіі да абсалютнага заняпаду і да такога становішча, калі талерантнасць ператваралася ў анахранізм з прычыны адсутнасці для рэфармацыйных плыняў годных канкурэнтаў.

Сапраўдны «бліцкрыг» Рэфармацыі быў сарваны контррэфармацыяй, што пачалася ў Княстве ў 1570 годзе [8, с. 406]. Поліканфесійная талерантная палітыка працягвала існаваць яшчэ пэўны час. Паўстае пытанне: ці не спрычынілася контррэфармацыя, як не парадаксальна гэта гучыць, да падаўжэння перыяду поліканфесійнай талерантнасці? Сапраўды, актыўная дзейнасць сіл контррэфармацыі стала супрацьвагай для рэфармацыйных плыняў. Сутыкненне з магутным канкурэнтам прыпыніла экспансію пратэстантызму, які быў значнай перашкодай на шляху каталіцтва да ўмацавання. Перыяд поліканфесійнай талерантнасці атрымаў працяг менавіта з-за балансу паміж веравызнаннямі, контррэфармацыя садзейнічала гэтаму мімаволі. У студзені 1573 года канвакацыйны сойм прыняў акт варшаўскай канфедэрацыі, што замацаваў поўную свабоду веравызнанняў у Рэчы Паспалітай і дэклараваў рэлігійную роўнасць прадстаўнікам усіх хрысціянскіх плыняў, незалежна ад саслоўя [5, с. 233].

Акт варшаўскай канфедэрацыі ўвайшоў у склад Статута ВКЛ 1588 года, дзе адзначалася: «... абяцаем..., што мы, якія з'яўляемся living рознымі ў веры, мір паміж сабою захоўваць, а ў сувязі з розніцай веры... крыві не праліваць і не караць..., і ніякаму вяршэнству, ані ўраду, да такога ўчынка ніякім чынам не дапамагаць...» [5, с. 233; 9, с. 43]. Далейшыя падзеі, звязаныя з аслабленнем пратэстантызму і ўзмацненнем каталіцтва, прывялі да адмовы ад норм верацярпімасці і пачатку рэалізацыі уніфікуючай мадэлі (перыяд каталіцка-уніяцкага дамінавання 1596 – 1795 гг.) [4, с. 39].

Аналіз канфесійных працэсаў у ВКЛ у другой палове XVI ст. дае магчымасць зразумець некаторыя механізмы фарміравання базавых верацярпімай і уніфікуючай мадэляў рэлігійных адносін, якія актуальныя не толькі для гэтага часу, а з'яўляюцца універсальнымі для ўсяго перыяду існавання Княства.

Па-першае, наяўнасць некалькіх веравання, прэтэндуючых на прыхільнасць насельніцтва, аўтаматычна азначае іх канкурэнцыю. Кожная плынь імкнецца паслабіць іншыя, далучыць іх вернікаў. У такіх умовах цярплівасць да іншых плыняў не ўласцівая (і не можа быць уласцівай) ніводнаму рэлігійнаму руху. Таму паміж імі заўсёды адбываецца змаганне, больш ці менш інтэнсіўнае і заўважнае. Калі плынь можа паслабіць сваю суперніцу, то робіць гэта. Калі дзьве плыні валодаюць прыкладна аднолькавымі рэсурсамі, адкрытая барацьба не дае вынікаў. Захады адной канфесіі ўраўнаважваюцца адэкватным адказам другой. Тады веравызнанні пераходзяць да вымушанага больш-менш мірнага суіснавання. Яно доўжыцца, пакуль адна з плыняў не апынецца ў крызісе ці не ўзмацніцца, або пакуль не з'явіцца новы рэлігійны рух (перыяд біканфесійна-парытэтнай талерантнасці 1447 – 1563 гадоў – раўнавага паміж праваслаўем і каталіцтвам) [4, с. 39]. Баланс паміж канфесіямі можа быць таксама вынікам узмацнення ці заняпаду адной з іх. Тады на пэўны час патэнцыял плыняў становіцца прыблізна роўным, што вядзе да ўсталявання верацярпімасці (раўнавага паміж пратэстантызмам і каталіцтвам – перыяд поліканфесійнай талерантнасці – вынік спачатку рэзкага ўзмацнення першага і аслаблення апошняга, а потым наадварот). У кожным выпадку раўнавага гэтая дынамічная.

Па-другое, паколькі ў адпаведнасці з практыкай феадалізму рэлігійныя інстытуты ў ВКЛ выконвалі ў тым ліку палітычныя, ідэалагічныя, сацыяльныя функцыі, актыўны ўплыў на веравызнанні аказвала дзяржава. Ёй неабходна, каб міжканфесійныя стасункі складаліся такім аптымальным чынам, што спрыялі б кансалідацыі грамадства і не адцягвалі б рэсурсаў на міжрэлігійную барацьбу. Адным са шляхоў дасягнення грамадскага спакою ў гэтым сэнсе з'яўляецца спрыянне канфесійнай аднароднасці насельніцтва. Сапраўды, пры наяўнасці аднаго веравызнання міжканфесійная барацьба па зразумелай прычыне адсутнічае ў прынцыпе. Калі дзяржава абірае гэты шлях, то праводзіць уніфікуючую палітыку – спрыяе таму, каб насельніцтва спавядала адну веру. Пры гэтым улічваецца расстаноўка сіл і абіраецца тая рэлігійная плынь, садзейнічанне якой можа прынесці ўладзе найбольшыя выгоды (моцная, карысная ў знешняй палітыцы – посттрыдэнцкае каталіцтва, напрыклад). Уніфікуючая палітыка патрабуе шмат часу, вялікіх рэсурсаў і пры пэўных абставінах можа прывесці не да стабільнасці, а да палярызацыі грамадства, працяглага абвастрэння рэлігійных, палітычных, сацыяльных канфліктаў (перыяды рэлігійнага радыкалізму 1387 – 1447 гадоў і каталіцка-уніяцкага дамінавання 1596 – 1795 гг.) [4, с. 38 – 39]. Калі пры гэтым плынь, у дачыненні да якой праводзіцца уніфікацыя, валодае дастатковым патэнцыялам для эфектыўнага супрацьстаяння ёй, то яе захады супраць рэлігійнага манапалізму могуць спрыяць усталяванню талерантнасці. Зрэшты, верацярпімасць не ўзнікае сама па сабе, за яе трэба змагацца з рэлігійным манапалізмам [10, с. 65]. Яна становіцца вынікам перахода супернічаючых канфесій да больш-менш мірных узаемаадносін з прычыны бесперспектыўнасці актыўнай барацьбы ў склаўшыхся ўмовах, а таксама верацярпімай палітыкі дзяржавы, якой больш карысная такая сітуацыя, чым зацяжны канфлікт.

Па-трэцяе, у поліканфесійным грамадстве ніводная мадэль рэлігійных адносін не вечная. Тэарэтычна, рэалізацыя уніфікуючай мадэлі можа садзейнічаць кансалідацыі насельніцтва на грунце аднаго веравызнання, але такая палітыка патрабуе шмат часу і звычайна не даводзіцца да завяршэння. Верацярпімая мадэль можа забяспечыць стабільнасць. Але яна не здольная закансерваваць яе. Раўнавага носіць дынамічны характар. Пад покрывам талерантных рэлігійных адносін адбываюцца маштабныя працэсы. Так, у перыяды панавання талерантнасці ў ВКЛ праваслаўе і каталіцтва наступалі на паганства, потым імкліва ўмацоўвалася каталіцтва, затым яго і праваслаўе цяснілі рэфармацыйныя плыні, прычым каталіцтва ва ўмовах верацярпімасці здолела адрадзіцца і падрыхтавацца да адпору. Узмацненне аднаго рэлігійнага руху або аслабленне другога вядзе да ліквідацыі самой верацярпімай мадэлі – для дамінуючай рэлігіі няма супрацьвагі.

Такім чынам, наяўнасць у Вялікім княстве Літоўскім некалькіх масавых уплывовых плыняў мела вынікам складванне пэўных мадэляў узаемаадносін іх паміж сабой і з дзяржавай. Вывучэнне рэлігійных адносін падчас распаўсюджвання Рэфармацыі дае магчымасць убачыць іх трансфармацыю і зразумець некаторыя заканамернасці ўзнікнення і развіцця мадэляў. Пастаяннае суперніцтва плыняў адбывалася з рознай інтэнсіўнасцю, былі перыяды актыўнай барацьбы і адносна мірнага суіснавання. Расклад сіл рэлігійных рухаў даваў дзяржаве арыентыры для выпрацоўкі і правядзення ёю канфесійнай палітыкі. Адносіны ў асяроддзі свецкага насельніцтва і дзяржаўная палітыка разам фарміравалі той ці іншы варыянт верацярпімай або уніфікуючай мадэлі. Перманентныя рэлігійныя працэсы ўплывалі на далейшае развіццё ўзаемаадносін веравызнанняў і дзяржавы.

## ЛІТАРАТУРА


1. Макарий. История русской церкви. Кн. 5. Период раздела церкви на 2 митрополии. История Западнорусской, или Литовской митрополии (1458 – 1596). – [Electronic resource]. – Mode of access: http: // www.rus-sky.com/church_his/cont.html.
2. Бардах Ю. Штудыі з гісторыі ВКЛ. – Мн.: В.а., 2002. – 459 с.
3. Падокшын С.А. Унія. Дзяржаўнасць. Культура. (Філасофска-гістарычны аналіз). – 2-е выд. – Мн.: Беларуская навука, 2000. – 111 с.
4. Чараўко В.У. Рэлігійная гісторыя Беларусі: эпохі, этапы, перыяды // Труды молодых специалистов Полоцкого гос. ун-та. – Вып. 10. Гуманитарные науки. – 2005. – С. 37 – 40.
5. Сагановіч Г. Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасці да кан. XVIII ст. – Мн. Энцыклапедыкс, 2001. – 412 с.; іл.
6. Уния в документах: Сб. / Сост. В.А. Теплова, З.И. Зуева. – Мн.: Лучи Софии, 1997. – 520 с.; ил.
7. История средних веков: В 2 т. Т. 2 / Под ред. С.Д. Сказкина, О.Л. Вайнштейна. – М.: Соцэкгиз, 1939. – 560 с.
8. Гісторыя Беларусі: У 2 ч. Ч. 1. Са старажытных часоў да кан. XVIII ст.: Курс лекцый / І.П. Крэнь, І.І. Коўкель, С.В. Марозава і інш. – Мн.: РІВШ БДУ, 2000. – 656 с.
9. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 года. – Мн.: Беларусь, 2002. – 207 с.; іл.
10. Верацярпімасць // Рэлігія і царква на Беларусі: Энцыкл. давед. / Рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мн.: БелЭн, 2001. – 368 с.; іл. – С. 65.